ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

**2021/2022 навучальны год**

**11 клас**

**Комплексная работа**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1.** Запішыце ў транскрыпцыі словы, у якіх ёсць прыстаўны (устаўны) гук [й].

*Колькасць балаў – 4*

| | | | |
|---|---|---|---|
| алімпіяда | | ад іскры | |
| гераіня | | іхні | |
| інтарэс | | іржышча | |
| заінтрыгаваць | | кліент | |
| яны | | электарат | |

**Заданне 2.** Устаўце прапушчаныя арфаграмы.

*Колькасць балаў – 6*

| | | |
|---|---|---|
| дрэсір…ваны | пературас…ваны | сч…саны |
| спрац…ваны | пранумар…ваны | раскрыж…ваны |
| стабіліз…ваны | перат…плены | прык…ваны |
| пераахал…джаны | разн…сены | перафарб…ваны |

**Заданне 3.** Укажыце, якімі членамі сказа з’яўляюцца падкрэсленыя словы і якой часцінай мовы яны выражаны.

*Колькасць балаў – 6*

1. Ляцела ўпартае “алё” па правадах паштовых.
2. Паміж 981 і 983 гадамі тураўскі князь Тур быў пазбаўлены ўлады.
3. У яго перахапіла дыханне.
4. Дзеда ўсюды носяць ногі, і к нам прыйдзе на хвілінку адпачыць з дарогі.
5. Пешы коннаму не таварыш.
6. На сцюдзёнай азёрнай вадзе, пад завеяй сярдзітай пургі, засталася сям’я лебядзей.

**Заданне 4.** Назавіце спосаб утварэння прыведзеных слоў. Запішыце ўласныя прыклады, якія адпавядаюць вызначанай папярэдне словаўтваральнай мадэлі.

*Колькасць балаў – 4*

| Слова для аналізу | Спосаб словаўтварэння | Уласны прыклад (адзін) па вызначанай мадэлі |
|---|---|---|
| уроссып | | |
| ураскідку | | |
| усебакова | | |

| урачыста | | |
|---|---|---|

**Заданне 5.** Перакладзіце на беларускую мову. Словазлучэнні запішыце ў левы слупок, а спалучэнні слоў, якія не з'яўляюцца словазлучэннямі, – у правы.

*Колькасць балаў – 5*

В зависимости от сведений, благодаря соседу, не обращать внимания на жару, в течение зимы, исходить из соображений, ответить на запрос, исходя из соображений, благодарить товарища, наподобие гриба, испытать беду.

| Словазлучэнні | Спалучэнні слоў |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 6.** Выпішыце са сказаў Якуба Коласа фразеалагізмы і растлумачце іх значэнне.

*Максімальная колькасць балаў – 5*

1. Перш чым звязваць сябе з той ці іншай партыяй, трэба ўважліва прыглядзецца, каб правільна выбраць дарогу. 2. Я зноў хачу, як і калісьці, з адкрытай, простаю душой на стык дарог знаёмых выйсці і пераклікнуцца з табой. 3. Насця нічога не сказала і толькі ўздыхнула, а Кузьма разгарачыўся, і панёсся як малады неаб'езджаны конь. 4. А жанкі глядзяць здзіўлёна, кінуць слоўка шапатком. 5. Дай бог шчасця вам і долі ўсім, хто слёзы praліваў.

| Сказ № | Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |

**Заданне 7.** Дзеясловы *апанаваць, апаніраваць, пасаваць, пасіраваць, параваць, парыраваць* запішыце замест пропускаў ў адпаведнай форме ў наступныя сказы:

*Колькасць балаў – 4*

1. Тонкія рысы твару неяк не ____________________ да такога дужага асілка, якім быў Андрэй. 2. Сваім хуткім наступленнем партызаны __________________ ўдар ворагаў.
3. Штосьці на гэты раз стрымала Сашу, __________________ яго звычайную рашучасць.4. Каб папярэдзіць падзенне або няшчасны выпадак падчас выступлення

Вольгі на турніку, Максім уважліва ________________ яе. 5.____________________ дысертацыю маладога даследчыка два вядомыя дактары філалагічных навук.
6. Вада знаходзіцца ў стане вечнага руху. Ад сонца яна ________________, з пары робяцца хмары, з хмар робіцца дождж.7. Калі ж __________________ ганчакі, воўк агрызнуўся, шчэрачы клыкі. 8. Падчас гульні ў карты Юрка часта __________________.

**Заданне 8.** Вызначце, што характарызуе развіццё беларускай літаратуры першай трэці ХХ стагоддзя:

*Колькасць балаў – 6*

а) актывізацыя літаратурна-грамадскага руху і ўздым культурнага будаўніцтва;
б) асаблівая ўвага да рэлігійных каштоўнасцей;
в) развіццё забаўляльных сцэнічных жанраў – камедый і вадэвіляў, у выніку чаго былі заснаваныя літаратурныя аб’яднанні “Маладняк”, “Полымя”, “Узвышша”;
г) вялікая колькасць перыядычных мультымедыйных літаратурных выданняў;
д) пераемнасць у развіцці літаратуры з традыцыямі “Нашай Нівы”;
е) творчы канфлікт паміж маладзейшым пакаленнем літаратараў і пісьменнікамі-класікамі часоў Антычнасці;
ж) паралельнае існаванне літаратуры БССР і Заходняй Беларусі.

**Заданне 9. Знайдзіце ў прыведзеных ніжэй сказах “лішнія” словы, якія не адпавядаюць сутнасці і зместу беларускай літаратуры і культуры.**

*Колькасць балаў – 4*

1. У працэсе развіцця нацыянальнай культуры адбываўся пераход персаніфікаваных міфалагічных вобразаў і матываў у павер’і, танцы, легенды, мелодыі, літаратурныя творы.

**Адказ:**______________________________________________________

1. Літаратура – гэта люстэрка мінулага і сучаснасці. Кніга – мудры спадарожнік і дарадца чалавека. Кнігі, у тым ліку створаныя ў дагістарычную эпоху, маюць пазнаваўчае багацце і вялікі чалавеказнаўчы змест.

**Адказ:**______________________________________________________

2. Публіцыстыка – разнавіднасць прозы. Выразны прыклад – серыя нарысаў Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» пра гісторыю, прыроду, геалогію Беларусі, культурныя традыцыі народа. Патрыятычная ідэя выразна праяўляецца ў нарысах. Гумарыстычныя, сатырычныя і іранічныя элементы ў выяўленні аўтарскіх адносін да асобных жыццёвых з’яў узбагачаюць тэкст. Твор звязаны з этнаграфіяй.

**Адказ:**______________________________________________________

3. Паэтычная ідэалізацыя – асноўны мастацкі прыём абрадавых песень і казак. Велічанне, заклінанне і праклёны – неад’емныя элементы абрадавай паэзіі.

**Адказ:**______________________________________________________

**Заданне 10. Выпішыце назвы радкоў (напрыклад, літары А, Б, Д), якія адлюстроўваюць ход развіцця беларускай літаратуры і дзе ўсе тры слупкі па сэнсе адпавядаюць адно аднаму. Вазьміце пад увагу, што ў табліцы прыведзены імёны пісьменнікаў, псеўданімы, назвы твораў, імёны персанажаў, гісторыка-літаратурныя факты і інш.**

*Колькасць балаў – 5*

| | | | |
|---|---|---|---|
| А | Францыск Скарына | Прадмова да кнігі «Новая зямля» | Полацк |
| Б | Максім Багдановіч | «Вянок», 1913 | «Маёвая песня» |
| В | Якуб Колас | «Паскудства, брат, і не пытайся!» | Дзядзька Антось |
| Г | Самуіл Плаўнік | Пісьменнік паказае майстэрства ў раскрыцці думак і перажыванняў  Тэклі, якая наведвае сына | Змітрок Бядуля |
| Д | Аркадзь Куляшоў | Уладзімір Мулявін | «Завушніцы» |
| Е | Мікалай Карлавіч Раманоўскі | Бацькі і дзеці: праблемы гуманнасці, высакароднасці, сумленнасці. | Аўтар дае характарыстыку Даніку Мальцу праз канкрэтныя выразныя дэталі. |
| Ж | Іван Дамінікавіч Луцэвіч | Праўда Сымона і праўда Зоські. Старац як выразнік народнай маралі. | «Новая зямля» |
| З | Уладзімір Мулявін | Пятрусь Броўка | «Александрына» |
| І | Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі. | Яўген Іванавіч Скурко | Максім Танк |

**АДКАЗ:__________**

ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”

**2021/2022 навучальны год**

**11 клас**
**Комплексная работа**
**ДАВЕДКІ**

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 2 | 6 | 6 | 4 | 5 | 5 | 4 | 6 | 6 | 6 | 50 |

**Заданне 1.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| алімпіяда | [ал'імп'іjада] | ад іскры | |
| гераіня | | іхні | [jіхн'і] |
| інтарэс | | іржышча | |
| заінтрыгаваць | | кліент | [кл'іjэнт] |

| | | | |
|---|---|---|---|
| яны | [јаны] | электарат | |

**Заданне 2.**

| | | |
|---|---|---|
| дрэсір*а*ваны | ператас*а*ваны | сч*а*саны |
| спрац*а*ваны | пранумар*а*ваны | раскрыж*а*ваны |
| стабіліз*а*ваны | перат*о*плены | **прык*а(о)*ваны** |
| переахал*о*джаны | разн*е*сены | **перафарб*а(о)*ваны** |

**Заданне 3.** 1. “Алё – дзейнік, выражаны выклічнікам.
2. Князь – прыдатак (азначэнне), выражаны назоўнікам.
3. У яго – дапаўненне, выражанае займеннікам з прыназоўнікам.
4. Адпачыць – акалічнасць, выражаная інфінітывам.
5. Не таварыш – выказнік, выражаны назоўнікам з адмоўнай часціцай.
6. Сям’я лебядзей – дзейнік, выражаны назоўнікам у форме назоўнага склону з назоўнікам роднага склону.

**Заданне 4.**

| Слова для аналізу | Спосаб словаўтварэння | Уласны прыклад па вызначанай мадэлі **(варыянты)** |
|---|---|---|
| уроссып | прыставачна-нульсуфікальны | уроскід |
| уроскідку | прыставачна-суфіксальны | уперавалку |
| усебакова | суфіксальны | устойліва |
| урачыста | суфіксальны | упарта |

**Заданне 5.**

| Словазлучэнні | Спалучэнні слоў |
|---|---|
| не зважаць на спёку | у залежнасці ад звестак |
| зыходзіць з меркаванняў | дзякуючы суседу |
| адказаць на запытанне | на працягу зімы |
| дзякаваць таварышу | зыходзячы з меркаванняў |
| спазнацца з бядой (*спазнаць бяду*) | накшталт грыба |

**Заданне 6.**

| № сказа | Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|---|
| 1. | Выбраць дарогу | *Вызначыць, як належыць дзейнічаць.* |
| 2. | З адкрытай душой | *Шчыра, даверліва.* |
| 3. | Як малады неаб’езджаны конь | *З вялікай хуткасцю.* |
| 4. | Кінуць слоўка | *Коратка сказаць аб чым-небудзь.* |
| 5. | Праліваў слёзы | *Сумаваў, плакаў.* |

**Заданне 7.**

1) Тонкія рысы твару неяк не пасавалі да такога дужага асілка, якім быў Андрэй. 2) Сваім хуткі наступленнем партызаны парыравалі ўдар ворагаў. 3)

Штосьці на гэты раз стрымала Сашу, апанавала яго звычайную рашучасць. 4) Каб папярэдзіць падзенне або няшчасны выпадак падчас выступлення Вольгі на турніку, Максім уважліва пасіраваў яе. 5) Апаніравалі дысертацыю маладога даследчыка два вядомыя дактары філалагічных навук. 6) Вада знаходзіцца ў стане вечнага руху. Ад сонца яна паруе, з пары робяцца хмары, з хмар робіцца дождж. 7) Калі ж апанавалі ганчакі, воўк агрызнуўся, шчэрачы клыкі. 8) Падчас гульні ў карты Юрка часта пасаваў.

**Каментарый. За кожнае правільна ўпісанае слова налічваецца 0,5 бала. Словы трэба было ўстаўляць у адпаведнасці з наступнымі значэннямі**.

АПАНАВАЦЬ, -нуе; зак., каго-што. 1. Ахапіць, авалодаць поўнасцю (пра настрой, думкі, пачуцці, а таксама пра фізічны стан чалавека. // Перамагчы, узяць верх (над настроем, думкамі, пачуццямі і пад.). 2. Напасці ў вялікай колькасці, акружыць з усіх бакоў.

АПАНІРАВАЦЬ, -рую, -руеш, -руе; незак. Выступаць у якасці апанента на дыспуце, спрэчцы; быць чыім-небудзь апанентам. // Наогул пярэчыць каму-небудзь у спрэчцы.

ПАСАВАЦЬ[1], суе; незак. Падыходзіць, адпавядае каму-небудзь, чаму-небудзь. Сукенка пасуе дзяўчыне.

ПАСАВАЦЬ[2], сую, -суеш, -суе; незак., што і без дап. Перадаваць адзін другому мяч, шайбу і пад. у спартыўнай гульні. Пасаваць мяч.

ПАСАВАЦЬ[3], сую, -суеш, -суе; незак. 1. Пры гульні ў карты адмовіцца ўдзельнічаць у розыгрышы да наступнай раздачы карт. 2. перан.; перад кім-чым і без дап. Прызнаваць сябе бяссільным перад чым-небудзь; здавацца. Пасаваць перад старэйшымі.

ПАСІРАВАЦЬ, -рую, -руеш, -руе; зак. і незак. (ад фр. passer – перадаваць). Спец. Падтрымліваць (спартсмена, артыста), каб папярэдзіць падзенне або іншыя няшчасныя выпадкі пры выкананні акрабатычных, гімнастычных, цыркавых практыкаванняў.

ПАРАВАЦЬ, -руе; незак. Вылучаць пару.

ПАРЫРАВАЦЬ, -рую, -руеш, -руе; зак. і незак., што. 1. Адбіць (адбіваць) (удар; першапачаткова – у фехтаванні). 2. перан. Абвергнуць (абвяргаць) (чые-небудзь довады, нападкі і пад. у спрэчках).

**Заданне 8.** А, Д, Ж

**Заданне 9.**

1. Танцы, мелодыі.
2. У тым ліку створаныя ў дагістарычную эпоху.
3. Сатырычныя.
4. Казак, праклёны.

**Заданне 10.** Б, В, Г, З, І

ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”